Кобрынская цэнтральная бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за студзень 2015 г.

**1-31 студзеня**

У рамках месячніка вернутай кнігі амаль ва ўсіх сельскіх філіялах прайшлі акцыі “Встречаем должников без нравоучений”, “Эта книга лучше всех - у неё большой успех”, “В гостях хорошо, а дома лучше” і інш. У час акцый арганізаваны Дні самакіравання, бібліятэкары наведалі чытачоў на даму. Карыстальнікам, якія прыйшлі ў бібліятэку ў час акцыі ўручаны сюрпрызы – кніжныя закладкі.

*сельскія філіялы*
*Мерапрыемствы ў рамках месячніка вернутай кнігі*

**3 студзеня**

Выстава бацькоўскіх парад “Дзіцячыя кнігі на ўсе часы”, на якой прадстаўлены кнігі дзіцячых пісьменнікаў, прапанаваныя бацькамі. На кожнай кнізе змешчаны водгук-рэкамендацыя з фотоздымкам таго з бацькоў, хто прапанаваў кнігу.

*Лукская СБ, 25 чал.*

**5 студзеня**

Дзень абмену прафесійным вопытам сярод супрацоўнікаў ЦБС, на якім калегі мелі магчымасць падзяліцца адзін з адным новымі напрацоўкамі, матэрыяламі і атрымаць парады, пажаданні кіраўнікоў.

*ЦБ, 60 чал.*

**5 студзеня**

Гульнёвая праграма "Навагоднія цуды", у якой прынялі ўдзел дзеці 1- 4 класаў. Прысутныя з задавальненнем адказвалі на пытанні віктарыны "Навагоднія цуды з усяго свету", адгадвалі загадкі ад Снежнай каралевы, прыбіраліся на баль да Кікімары, удзельнічалі ў конкурсах "Снежка", "На мётлах вакол ёлкі”. Для ўдзельнікаў праграмы падрыхтаваны інфармацыйны агляд "Навагоднія цуды ў збанку".

*Гарадзецкая СБ, 20 чал.*
*Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Ражства*

**6 студзеня**

Ў чытальнай зале цэнтральнай бібліятэкі пачала функцыянаваць выстава-панарама “Гісторыі слаўнай вялікая дата”. Выстава прапануе не толькі кнігі, але і артыкулы з газет і часопісаў, фотаздымкі, статыстычныя матэрыялы. Яна дае магчымасць прасачыць гістарычнае, сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна, пазнаёміць з рэкламна-выдавецкай прадукцыяй цэнтральнай бібліятэкі.

*ЦБ*
*Мерапрыемствы да 75-годдзя утварэння Кобрынскага раёна*

**8 студзеня**

Дзень адчыненых дзвярэй “Библиотека, книжка, я-вместе верные друзья”. У праграме свята: кніжная выстава “С новой книгой в Новый год”, ушанаванне новых чытачоў.

*Кіселявецкая СБ, 18 чал.*
*Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Ражства*

**8 студзеня**

Літаратурна - музычная гасцёўня "Светлый праздник Рождества-нет чудесней торжества " сумесна с СДК. Са святам павіншаваў настаяцель Свята - Узнясенскай царквы в. Гарадзец іерэй Георгій, да віншаванняў з Каляднымі спевамі далучыўся дарослы хор

Свята - Узнясенскай царквы,  дзіцячы хор васкрэснай школы, удзельнікі якога не толькі спявалі, але і чыталі вершы на Калядныя тэмы.

*Гарадзецкая СБ, 30 чал.*
*Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Ражства*

**8 студзеня**

У чытальнай зале бібліятэкі арганізавана выстава юбілейных кніг 2015 года “Кнігі запрашаюць на юбілей “. Выстава прапануе пазнаёміцца з юбілейнымі творамі беларускай, расійскай і замежнай літаратуры.

*ЦБ*

**13 студзеня**

Падворкавы абход самых актыўных чытачоў “Шчодры вечар, добры вечар!”. У праграме: тэатралізаванае прадстаўленне з удзелам казы, віншаванні жыхароў, спеў калядных песень. Кожнаму чытачу на памяць уручаны бібліятэчныя буклеты.

*Балоцкая СБ, 20 чал.*
*Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Ражства*

**22 снежня-22 студзеня**

Конкурс "Дрэва жаданняў", умова якога - выраб навагодніх атрыбутаў з розных матэрыялаў у розных тэхніках. Па выніках конкурсу вызначаны пераможцы , якія атрымалі памятныя сувеніры. Асобным блокам выдзелены працы Барычэўскай Таццяны Васільеўны, якія выкананы ў розных стылях: вышыўка, выраб букетаў з цукерак, арыгамі, лепка з гліны і інш .

*Астроміцкая СБ, 30 чал.*
*Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Ражства*

**14студзеня**

Урок краязнаўства, прысвечаны 75-годдзю ўтварэння Кобрынскага раёна “Багатае мінулае, дастойнае сучаснае”. У праграме:

- гісторыя утварэння  раёна;
- прагляд відэапрэзентацыі “Край мой родны”;
- віктарына “Як мы ведаем наш край”.

*Залеская СБ, 20 чал.*
*Мерапрыемствы да 75-годдзя утварэння Кобрынскага раёна*

**16 студзеня**

У выставачнай зале Палаца культуры цэнтральная бібліятэка прадставіла ўвазе гасцей кніжна - дакументальную выставу - панараму « Кобрыншчына : багатае мінулае , дастойнае сучаснае ".

*ЦБ, 200 чал.*
*Мерапрыемствы да 75-годдзя утварэння Кобрынскага раёна*

**17 студзеня**

Літаратурна-музычная кампазіцыя “Мая старонка родная, няма мілей і прыгажэй, чым ты…”. Прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй утварэння Кобрынскага раёна, паслухалі вершы кобрынскіх паэтаў, прысвечаныя роднаму краю, паглядзелі прэзентацыю аб Кобрынскім раёне « Кобрыншчына : багатае мінулае , дастойнае сучаснае ".

*Лукская СБ, 25 чал.*
*Мерапрыемствы да 75-годдзя утварэння Кобрынскага раёна*

**18 студзеня**

Інфармацыйна-пазнавальная гадзіна “Наша Кобрыншчына”. Да ўвагі прысутных прапанавана кніжная выстава “Зямля,адкуль мы родам” і электронная прэзэнтацыя “Кобрыншчына: багатае мінулае, дастойнае сучаснае”.

*Шамятоўская СБ, 23 чал.*
*Мерапрыемствы да 75-годдзя утварэння Кобрынскага раёна*

**19 студзеня**

Пазнавальны ўрок "Пасля школы - ў бібліятэку" для 2- х класаў. Для юных карыстальнікаў прадстаўлены агляд перыядычных выданняў "Чытач мой, усё гэта для цябе", дзе дзеці даведаліся, якія новыя перыядычныя выданні выпісвае бібліятэка . Прадстаўлена выстава, прысвечаная 70- годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў " Подзвіг вялікі і вечны" .

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

Да 75-годдзя з часу ўтварэння Кобрынскага раёна бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтаваны бібліяграфічны спіс “Па зямлі Кобрынскай”, які ўключае паўнатэкставую звестку аб знамянальнай падзеі і падрабязны спіс крыніц да яе.

*ЦБ*

Да 75-годдзя з часу ўтварэння Кобрынскага раёна бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі выдадзены інфармацыйны дайджэст “Кобрыншчына ў лічбах”, які адлюстроўвае асноўныя лічбавыя даныя аб Кобрынскім раёне.

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены зборнік метадычных рэкамендацый па духоўна - маральнаму выхаванню «Праз кнігі - да духоўнасці».

*ЦБ*

Выканаўца
Мілашук Т.І.
АБМ
2-36-81